# ВІЛЕНСКАЕ ПЫТАННЕ

## ПРАБЛЕМА ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЫНАЛЕЖНАСЦІ ВІЛЕНСКАГА КРАЮ Ў МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІНАХ (1918–1921 ГАДЫ)



Віталь АШАРЧУК

СЛОВА МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ

**Віленская праблема ў міжнародных адносінах не зводзіцца да польска-літоўскага канфлікту з-за тэрыторыі Віленскага краю. Па-першае, барацьба за Вільню, як і за іншыя спрэчныя тэрыторыі (Гарадзеншчыну і Сувалкаўшчыну), была адным з аспектаў польска-літоўскага канфлікту, выкліканага і супярэчнасцю поглядаў на сутнасць узаемаадносін паміж гэтымі дзяржавамі. Літва выступала супраць якіх-небудзь дзяржаўных сувязей з Польшчай, а Польшча імкнулася далучыць Літву праз федэрацыю ці звязаць яе палітычна-ваеннай канвенцыяй, фактычна ўстанавіўшы свой пратэктарат.**

Па-другое, у барацьбе за Віленскі край прымалі ўдзел не толькі Польшча і Літва, але і БНР. У адпаведнасці з трэцяй Устаўной граматай, Віленшчына абвяшчалася часткай БНР, і беларускія нацыянальныя дзеячы, нягледзячы на неспрыяльныя знешнепалітычныя абставіны, прэтэндавалі на гэтую тэрыторыю, хоць на фоне Літвы і Польшчы з’яўляліся аўтсайдэрамі. У пабудове дзяржаўнасці яны вымушаны былі шукаць падтрымкі Польшчы і Літвы, што давала магчымасць Каўнасу і Варшаве выкарыстоўваць беларускую карту ў барацьбе за Віленшчыну. Па-трэцяе, Польшча, Літва і БНР лічылі далучэнне Віленшчыны неабходным крокам у пабудове сваёй дзяржаўнасці. Літоўскія палітыкі імкнуліся пабудаваць этнаграфічную дзяржаву, яны бачылі пагрозу працэсу фарміравання літоўскай нацыі з боку польскай культуры. Яны абвясцілі Вільню сталіцай Літвы, не толькі жадаючы манапалізаваць гісторыка-культурную спадчыну Вялікага княства Літоўскага, але імкнучыся ў перспектыве адміністрацыйным шляхам знішчыць плацдарм распаўсюджвання польскай культуры ў Літве. У Польшчы Ю. Пілсудскі і яго прыхільнікі лічылі, што авалоданне Вільняй будзе «ключом» да стварэння саюза ўсходнееўрапейскіх дзяржаў-лімітрофаў пры гегемоніі Польшчы. Эндэкі (нацыянал-дэмакраты) дабіваліся стварэння польскай дзяржавы ў межах, «якія ахопліваюць усю тэрыторыю рассялення польскай нацыі». Дзеячы БНР бачылі ў Віленшчыне своеасаблівы «беларускі П’емонт». Па-чацвёртае, вырашальную ролю ў лёсе Віленскага краю адыгрывалі Францыя, Вялікабрытанія, Савецкая Расія, Германія, якія імкнуліся паўплываць на дзяржаўна-тэрытарыяльнае ўладкаванне ва Усходняй Еўропе, зыходзячы са сваіх знешнепалітычных інтарэсаў. Таму віленскае пытанне мы разумеем як комплекс супярэчнасцей не толькі паміж непасрэднымі прэтэндэнтамі на гэтую тэрыторыю, але і іншымі зацікаўленымі ў лёсе Віленшчыны дзяржавамі.

У Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропе вызначэнне межаў паміж новымі дзяржавамі адбывалася выключна ў рамках станаўлення Версальскай сістэмы міжнародных адносін. Ва Усходняй Еўропе дзяржавы-пераможцы вымушаны былі лічыцца з агульнай нестабільнасцю, выкліканай грамадзянскай вайной у Расіі і польска-савецкім узброеным змаганнем за гегемонію ў рэгіёне. Апошняе адкрывала магчымасці для Польшчы, Літвы і БНР у барацьбе за Віленшчыну палітычна манеўраваць, праводзіць палітыку ажыццёўленых фактаў, часам дзейнічаць насуперак еўрапейскім дзяржавам. У гэты перыяд фактар узброенага і дыпламатычнага польска-савецкага змагання за гегемонію ва Усходняй Еўропе вызначаў развіццё падзей у віленскай праблеме.

Задачы нашага даследавання – аналіз «віленскай» палітыкі Германіі, Савецкай Расіі, Францыі, Вялікабрытаніі, Польшчы, Літвы, БНР у азначаны перыяд.

Паражэнне Германіі ў Першай сусветнай вайне прывяло да таго, што дзяржаўныя ўтварэнні ва Усходняй Еўропе, якія Берлін ствараў у 1916–1918 гадах з мэтай адрыву акупіраваных тэрыторый ад Расіі, набылі незалежнасць. У перыяд з лістапада 1918 года да лютага 1919 года ўзнікненне і развіццё новых нацыянальных дзяржаў адбывалася ва ўмовах імкнення бальшавікоў заняць страчаныя паводле Брэсцкага міру тэрыторыі, каб непасрэдна ўплываць на рэвалюцыйныя падзеі ў Германіі і знаходжанне ў рэгіёне нямецкіх войскаў. Іх паскораная эвакуацыя адкрывала магчымасць саветызацыі дзяржаў-лімітрофаў, у той час як іх прысутнасць перашкаджала дзяржаўнаму будаўніцтву ў Літве, Польшчы, Беларусі. У гэты час віленская праблема афіцыйна паўстала ў польска-літоўскіх адносінах *[1, s. 25]*. Літоўская Тарыба (Савет) згаджалася супрацоўнічаць з Польшчай толькі пры ўмове прызнання незалежнасці Літвы са сталіцай у Вільні. Пілсудскі адзначаў, «што літоўцы павінны распаўсюджваць сваю ўладу толькі на тэрыторыі этнаграфічнай Літвы, бо гістарычная Літва з’яўляецца краем польскім» *[2, s. 121]*. Не было дасягнута дамоўленасці паміж Тарыбай і арганізацыямі віленскіх палякаў *[1, s. 27]*. Тады літоўскі ўрад перанёс сваю дзейнасць у паўночна-заходнюю Літву з цэнтрам у Каўнасе, дзе нямецкія войскі затрымаліся, прыкрываючы Усходнюю Прусію. Абарону Віленскага краю ад савецкіх войскаў узяла на сябе польская ваенна-палітычная арганізацыя «Самаабарона Літвы і Беларусі», аднак савецкія войскі ўвайшлі ў Вільню 5 студзеня 1919 года *[3, s. 30–32]*.

У канцы лістапада 1918 года Віленская беларуская рада (ВБР) і Тарыба заключылі дамову, згодна з якой Віленшчына і Гродзеншчына атрымлівалі ў складзе літоўскай дзяржавы шырокую аўтаномію *[4, с. 17]*. Прыхільнікі незалежнасці БНР на чале з А. Луцкевічам спадзяваліся, што пагадненне ВБР і Тарыбы стане асновай для будаўніцтва літоўска-беларускай дзяржавы, віленскае пытанне было б такім чынам дэзактуалізавана. Літоўская дыпламатыя імкнулася выкарыстаць дамову з ВБР, каб абгрунтаваць на міжнароднай арэне свае прэтэнзіі на Віленшчыну *[5, с. 56–72]*. У жніўні 1919 года літоўска-беларускія тэрытарыяльныя супярэчнасці абвастрыліся, урад БНР адмовіўся ад супрацоўніцтва з Літвой *[6, с. 122–126]*.

Германія ў канцы 1918 – пачатку 1919 года працягвала сваю ранейшую «літоўскую палітыку»: яна перашкодзіла палякам утрымаць Віленшчыну і адначасова аказала вайсковую і эканамічную дапамогу літоўскаму ўраду ў будаўніцтве дзяржаўнасці *[7, с. 38]*. Нямецкія войскі служылі гарантам бяспекі «Каўнаскай Літвы» не толькі адносна пагрозы саветызацыі ў студзені – красавіку 1919 года, але і перашкодзілі прасоўванню польскіх войскаў углыб Літвы ў красавіку – чэрвені таго ж года. У лютым 1919 года Германія пад ціскам Францыі пагадзілася прапусціць польскія войскі ў літоўска-беларускія землі, каб спыніць наступ савецкіх войскаў *[6, с. 57]*. Пілсудскі атрымаў магчымасць весці барацьбу за Віленшчыну і іншыя літоўскія і беларускія землі пад сцягам змагання з савецкай пагрозай. Польшча і Савецкая Расія ў барацьбе за Балтыйска-Чарнаморскі рэгіён выкарыстоўвалі прынцып самавызначэння нацый у якасці ідэалагічнай зброі, абвінавачваючы адна адну ў імперыялістычнай палітыцы. З лета 1919 года ўплывы Германіі ў Літве моцна аслаблі, аднак іх замянілі ўплывы Вялікабрытаніі.

Пілсудскі імкнуўся надаць захопу Вільні ў красавіку 1919 года характар далёка ідучай палітычнай акцыі *[1, s. 41]*. Абвешчаны ім прынцып самавызначэння народаў «былога Вялікага княства Літоўскага» ў нейкай ступені легалізаваў польскую ваенную прысутнасць на літоўска-беларускіх землях. Аднак авалоданне Вільняй не толькі не дало магчымасці Польшчы схіліць Літву да аб’яднання на прынцыпах

**АШАРЧУК**
**Віталь Аляксандравіч.**
Нарадзіўся ў 1986 годзе ў Гомелі. У 2008 годзе скончыў гістарычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.
У 2009 годзе паступіў у аспірантуру факультэта міжнародных адносін БДУ.
Друкаваўся ў навуковых зборніках «Беларусь і суседзі: гістарычныя шляхі, узаемадзеянне, узаемаўплывы», «Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці: да 90-годдзя ўтварэння БССР».
Сфера інтарэсаў: міжнародныя адносіны ва Усходняй Еўропе ў перыяд паміж Першай і Другой сусветнымі войнамі.

Навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар В.Г. Шадурскі.

Панарама Вільні.
Фота Я. Булгака, 1918 год



СЛОВА МАЛАДЫМ ВУЧОНЫМ

федэрацыі, але прывяло да абвастрэння адносін. Каўнас умовай раўнапраўнага ваенна-эканамічнага супрацоўніцтва з Польшчай лічыў прызнанне Віленскага краю часткай Літвы, Пілсудскі і польская дыпламатыя пад час перамоў з літоўцамі ў красавіку – жніўні 1919 года віленскае пытанне імкнуліся абысці *[8, s. 366]*. У жніўні 1919 – сакавіку 1920 года польскае кіраўніцтва вычарпала ўсе сродкі ціску на Літву, у тым ліку і спробу арганізаваць дзяржаўны пераварот, і было вымушана адкласці вырашэнне «літоўскай» праблемы на будучае *[9, с. 570]*.

Свае прэтэнзіі на Віленскі край Польшча і Літва абазначылі на Парыжскай канферэнцыі ў сакавіку 1919 года *[1, s. 35–36]*. Трэба адзначыць, што Літва на той час не была прызнана дзяржавамі Антанты, Польшча мела больш моцныя міжнародныя пазіцыі і прэтэндавала не толькі на Віленшчыну, але і на ўсю Літву. Вялікія еўрапейскія дзяржавы першапачаткова разглядалі віленскае пытанне ў кантэксце будучага размежавання Польшчы і Расіі пасля прыходу да ўлады ў апошняй «легітымнага» ўрада *[8, s. 314]*. Калі адносна неабходнасці стварэння незалежнай польскай дзяржавы ў краін Антанты сумненняў не ўзнікала, то Літву Францыя і Вялікабрытанія разглядалі як нешта часовае і лічылі, што яна павінна застацца ў складзе Расіі на прынцыпах аўтаноміі. Францыя зыходзіла з неабходнасці захавання непасрэднай расійска-нямецкай мяжы, спадзеючыся на аднаўленне франка-рускага саюза ў будучым. Вялікабрытанія разглядала Літву ў кантэксце агульнай палітыкі адносна прыбалтыйскіх дзяржаў – зыходзячы з інтарэсаў брытанска-расійскага гандлю *[8, s. 314]*. Створаная пад час парыжскай канферэнцыі балтыйская камісія на чале з Говардам, якая складала праект польска-літоўскай мяжы, прыпыніла сваю працу да вырашэння «рускага пытання» *[10, с. 39]*. Вярхоўны савет Антанты 8 снежня 1919 года прыняў дэкларацыю, дзе ў якасці часовай усходняй мяжы Польшчы была прызнана «лінія Камбона», якая супадала з этнічнымі межамі рассялення палякаў *[11, s. 532]*. Згодна з гэтым рашэннем Віленшчына не ўваходзіла ў польскую дзяржаву.



Салдаты літоўскага войска, 1919 год

У сваёй усходнееўрапейскай палітыцы Францыя і Вялікабрытанія не толькі пакідалі месца для «белай» Расіі, але і мелі ў адносінах да новых дзяржаў уласныя мэты. Францыя выказвала асаблівы інтарэс да Польшчы, а Вялікабрытанія – да прыбалтыйскіх дзяржаў. Вялікабрытанія была супраць стварэння моцнай Польшчы, баючыся парушэння раўнавагі ў Еўропе на карысць Францыі. Эксперты брытанскага МЗС 8 снежня 1918 года ў аналітычнай запісцы вызначылі ўсходнюю мяжу Польшчы ад Сувалак праз Гродна і па рацэ Заходні Буг да Галіцыі, пакідаючы Віленшчыну па-за ёй *[12, с. 29]*. На працягу 1919 года брытанская дыпламатыя неаднойчы рабіла заявы аб тым, што Вільня павінна належаць Літве, лёс якой знаходзіцца ў залежнасці ад выніку грамадзянскай вайны ў Расіі. Яна таксама падтрымлівала Каўнас у пытанні ўсталявання дэмаркацыйнай лініі з Польшчай *[13, s. 131]*. Францыя разглядала Літву як вынік палітычных інтрыг Германіі, таму ў віленскім пытанні, пазбягаючы прынцыповага прызнання польскіх тэрытарыяльных дамаганняў, тайна падтрымлівала Варшаву. Улетку 1919 года пры вызначэнні дэмаркацыйнай лініі штаб маршала Ф. Фоша пайшоў насустрач польскім патрабаванням *[1, s. 51]*. Восенню 1919 – вясной 1920 года брытанскі ўрад, прааналізаваўшы развіццё грамадзянскай вайны ў Расіі, вырашыў пашырыць свой палітычны і эканамічны ўплыў у Літве і іншых прыбалтыйскіх дзяржавах. У гэтых умовах брытанская дыпламатыя імкнулася не дапусціць польска-літоўскай вайны, працягвала падтрымліваць літоўскія прэтэнзіі на Віленскі край *[1, s. 88]*.

Поспехі Савецкай Расіі ў вайне з Польшчай летам 1920 года прывялі да больш рашучага ўмяшання дзяржаў Антанты ў

віленскае пытанне. У канцы сакавіка – пачатку красавіка 1920 года Літва і Савецкая Расія дамовіліся пачаць мірныя перагаворы, прычым Масква прынцыпова прызнала літоўскія правы на Віленскі край *[14, с. 43–44]*. Савецкае кіраўніцтва імкнулася заключыць з Літвой ваенны саюз супраць Польшчы *[1, s. 116]*. Намаганні польскай дыпламатыі перакапаць Літву ў неабходнасці сумеснай абароны Віленшчыны ад бальшавікоў не далі плёну *[1, s. 118]*. Вялікабрытанія ціснула на Літву, каб тая тэрмінова падпісала мір з Савецкай Расіяй, але не заключала з ёй ваеннага пагаднення і адначасова ўрэгулявала адносіны з Польшчай *[14, с. 52, 59]*. Літва вырашыла не заключаць ваеннага саюза з Савецкай Расіяй, пакінуўшы за сабой свабоду дзеянняў адносна магчымага наступлення супраць Польшчы на віленскім напрамку. Вялікабрытанія імкнулася стаць арбітрам у палітычна-тэрытарыяльным уладкаванні Усходняй Еўропы. На пасяджэнні Вярхоўнага савета Антанты ў Спа яе прадстаўнікі адной з умоў свайго пасрэдніцтва ў будучых перамовах з Савецкай Расіяй вылучылі часовую перадачу Віленскага краю Літве, канчатковае вырашэнне віленскага пытання было ў кампетэнцыі дзяржаў Антанты *[15, с. 151]*. Дамова паміж Польшчай і саюзнымі дзяржавамі, падпісаная 10 ліпеня 1920 года ў Спа, пазбавіла Варшаву свабоды дзеянняў і дала магчымасць Вялікабрытаніі і Францыі аказваць уздзеянне ў віленскай праблеме. Трэба адзначыць, што дамову ў Спа не выканалі абодва бакі. Польшча не перадала Віленшчыну пад часовае кіраванне Літвы, дзяржавы Антанты пасля адмовы Савецкай Расіі прыняць іх пасрэдніцтва не аказалі Польшчы рашучай падтрымкі. Савецкая Расія здолела коштам перадачы Віленшчыны перацягнуць Літву на свой бок і перамагчы ў дыпламатычнай барацьбе Вялікабрытанію. Маскоўская мірная дамова 12 ліпеня 1920 года стала падставай для фарміравання ў будучым савецка-літоўскага квазі-саюза. Савецкая Расія пачала адыгрываць ролю аднаго з галоўных удзельнікаў віленскага канфлікту, хоць першапачаткова лічыла падтрымку Літвы тактычным ходам, не скідваючы, аднак, з рахунку магчымасці яе саветызацыі *[16, с. 41–45]*.

Пасля таго як брытанскія спробы замірэння і стабілізацыі Усходняй Еўропы праваліліся, а польскія войскі змаглі вярнуць сабе стратэгічную ініцыятыву ў вайне з Савецкай Расіяй, Францыя імкнецца дабіцца польска-літоўскага збліжэння на аснове фактычнага прызнання прыналежнасці Віленскага краю да Літвы *[1, s. 134–135]*. Спроба Польшчы выцесніць літоўскія войскі з рэгіёну Сувалак прывяла ў канцы жніўня – пачатку верасня 1920 года да неаб'яўленай польска-літоўскай вайны, якая выклікала новае ўмяшанне з боку еўрапейскіх дзяржаў. Брытанскае пасольства ў Варшаве патрабавала ад польскага ўрада тэрмінова пачаць перамовы з Літвой і саступіць ёй Віленскі край *[13, s. 267]*. На пасяджэнні Савета Лігі Нацый брытанскі дэлегат Фішар прапанаваў нейтралізацыю Літвы ў межах Маскоўскай дамовы 12 ліпеня 1920 года *[13, s. 268]*. Пастанова Савета Лігі Нацый адзначала, што Вільня павінна належаць Літве, а тэрыторыя на ўсход ад горада знаходзіцца пад кантролем Лігі Нацый *[17, с. 39–40]*. Для рэалізацыі рэкамендацый Лігі Нацый была створана спецыяльная назіральная камісія пад кіраўніцтвам палкоўніка Шардзіны *[1, s. 189]*. 30 верасня 1920 года пры яе пасрэдніцтве ў Сувалках пачаліся польска-літоўскія перагаворы. Літоўскае кіраўніцтва было гатова саступіць Польшчы большую частку спрэчных тэрыторый, каб захаваць Вільню. Дагавор у Сувалках 7 кастрычніка 1920 года непасрэдна віленскае пытанне не закранаў *[11, s. 118–119]*.



Генерал
Л. Жалігоўскі

Выступленне генерала Л. Жалігоўскага 8–9 кастрычніка 1920 года было інспіравана Пілсудскім і колам яго паплечнікаў і мела накіраванасць не толькі на захоп Віленскага краю, ва ўмовах, калі польская непасрэдная ваенная акцыя была



Польскія салдаты ў Вільні, кастрычнік 1920 года

немагчыма з-за пазіцыі дзяржаў Антанты, аднак праследавала больш шырокія палітычныя мэты. Пасля абвяшчэння Сярэдняй Літвы Жалігоўскі прапанаваў ураду Літвы ў Каўнасе і прадстаўнікам беларускіх арганізацый накіраваць сваіх прадстаўнікоў у Вільню для ўдзелу ва ўрадзе Сярэдняй Літвы *[17, с. 43]*. Жалігоўскі ў кастрычніку 1920 года, зноў, як і Пілсудскі ў красавіку 1919 года, дзейнічаў пад лозунгам права насельніцтва Віленшчыны самастойна вызначаць сваю дзяржаўную будучыню.

Трэба адзначыць, што, з аднаго боку, літоўскі ўрад меў слабыя пазіцыі ў Віленскім краі, а літоўскае этнічнае насельніцтва не складала тут большасці, з другога боку, польскае насельніцтва Віленшчыны, якое таксама не мела абсалютнай большасці, выступала за тэрміновае далучэнне да Польшчы. Гэтая сітуацыя была спрыяльнай для беларускіх нацыянальных дзеячаў, бо для іх польска-савецкая прэлімінарная дамова несла пагрозу палітычнага банкруцтва. Аднак у кастрычніку – лістападзе 1920 года яны па-ранейшаму прытрымліваліся рознай знешнепалітычнай арыентацыі, былі арганізацыйна раздробленыя, таму зноў аказаліся ў ролі другарадных партнёраў Польшчы і Літвы. Урад БНР В. Ластоўскага 11 лістапада 1920 года заключыў пагадненне з Літвой аб сумесным дыпламатычным і ваенным змаганні супраць Польшчы за літоўска-беларускія землі, прычым вызначэнне беларуска-літоўскай мяжы было адкладзена на будучае *[6, с. 228–230]*. Беларуска-літоўская дамова 12 кастрычніка 1920 года не стасавалася з Маскоўскай савецка-літоўскай дамовай 12 ліпеня 1920 года. Міністр замежных спраў Літвы Ю. Пурыцкіс 19 лютага 1921 года адзначыў Ластоўскаму, што паўднёва-ўсходняя мяжа Літвы існуе дэ-юрэ і пагадзіўся на стварэнне ў будучым «беларускай палітычнай адзінкі ў федэратыўнай сувязі з Літвой» на поўдзень ад лініі Маскоўскай дамовы *[18, s. 239]*. Прыхільнікі Найвышэйшай рады БНР падтрымалі акцыю Жалігоўскага і занялі шэраг другарадных пасад у яго ўрадзе *[17, с. 43]*.

Вялікабрытанія і Францыя ў адказ на бунт Жалігоўскага спачатку здзейснілі жорсткі дыпламатычны дэмарш, аднак сур'ёзных санкцый у адносінах да Польшчы не настала *[13, s. 271]*. Французская дыпламатыя ў лістападзе 1920 года імкнулася давесці на міжнароднай арэне, што дамова ў Спа страціла актуальнасць, перашкодзіла «Каўнаскай Літве» разгарнуць баявыя дзеянні супраць Жалігоўскага, нейтралізавала найбольш радыкальныя прапановы Вялікабрытаніі адносна пакарання Польшчы. МЗС Францыі ў студзені 1921 года запэўніла польскіх дыпламатаў, што Літва не будзе прызнана да вырашэння віленскага пытання *[19, s. 299]*. Савет Лігі Нацый разгледзеў віленскае пытанне ў канцы лістапада 1920 года і прапанаваў вырашыць яго шляхам плебісцыту пад кантролем наглядальнікаў і вайсковых кантынгентаў нейтральных дзяржаў, што ўваходзілі ў Лігу Нацый *[1, s. 208]*. Літве плебісцыт на Віленшчыне не прынёс бы станоўчых вынікаў, таму яна, даўшы фармальную згоду, імкнулася пазбегнуць яго *[1, s. 209]*. Польшча баялася стварэння прэцэдэнту адносна Усходняй Галіцыі. Плебісцыт пад кантролем Лігі Нацый быў на руку толькі дзеячам БНР, але ўрад Ластоўскага, які дзейнічаў у рэчышчы літоўскай палітыкі, спачатку таксама пратэставаў супраць яго *[6, s. 232–237]*.

У лістападзе 1920 года змянілася пазіцыя Вялікабрытаніі ў віленскім пытанні. Адпаведна з новай брытанскай канцэпцыяй яго трэба было вырашаць праз стварэнне

польска-літоўскай федэрацыі, прычым Вільня павінна была адысці Літве *[13, s. 275]*. Такую ж пазіцыю заняла і французская дыпламатыя. Няўдачай скончыліся польска-літоўскія перамовы ў Варшаве ў студзені 1921 года: на іх павінна была быць вызначана тэрыторыя правядзення плебісцыту. Савецкая Расія рашуча выступіла супраць знаходжання ў Віленскім краі войскаў пад кіраўніцтвам Лігі Нацый *[20, с. 496–497]*. Усе гэтыя фактары прывялі да таго, што ў сакавіку 1921 года Ліга Нацый адмовілася ад правядзення плебісцыту ў Віленскім краі. Гэты крок азначаў таксама фактычную згоду вялікіх еўрапейскіх дзяржаў на далейшую прысутнасць войскаў Жалігоўскага на тэрыторыі Віленшчыны. Адмова ад правядзення плебісцыту ў Віленскім краі найбольш ударыла па беларускіх дзеячах, якія з таго часу пачалі страчваць сваё значэнне ў вачах Польшчы і Літвы.

Савецкая Расія восенню 1920 – вясной 1921 года была зацікаўлена ў зацягванні польска-літоўскага канфлікту, каб не дапусціць паляпшэння стратэгічнага становішча свайго праціўніка пад час прадаўжэння рыжскіх перагавораў. Савецкае кіраўніцтва прапанавала Літве розныя варыянты сваёй дапамогі ва ўзмацненні ваеннага патэнцыялу і настойвала на рашучых дзеяннях Каўнаса ў дачыненні да Жалігоўскага. Адначасова Масква аказвала дыпламатычны ціск на Польшчу, неаднаразова адзначаючы, што акцыя Жалігоўскага і ўмяшанне Лігі Нацый у віленскае пытанне ёсць парушэнне рыжскіх дамоўленасцей 12 кастрычніка 1920 года *[20, с. 386]*. Хоць Масква адпаведна з імі фактычна абавязвалася не ўмешвацца ў віленскае пытанне, яна не дэнансавала Маскоўскі дагавор з Літвой і пастаянна падкрэслівала, што лічыць яго дзейсным і надалей *[20, с. 510]*. Падпісанне польска-савецкага мірнага дагавора ў Рызе 18 сакавіка 1921 года падвяло рысу пад перыядам агульнай нестабільнасці ў Балтыйска-Чарнаморскім рэгіёне Усходняй Еўропы. Далейшая барацьба ў віленскім пытанні вялася выключна дыпламатычнымі сродкамі. ■

## ЛІТАРАТУРА


1. Lossowski, P. Konflikt polsko-litewski. 1918–1920 / P. Lossowski. – Warszawa: Instytut Wydawniczy Pax, 1996. – 243 s.
2. Lewandowski, J. Federalizm. Litwa i Białoruś w polityce obozu belwederskiego (XI. 1918 – IV. 1920). / J. Lewandowski. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1962. – 240 s.
3. Łukomski, G. Walka Rzeczypospolitej o kresy północno-wschodnie. 1918–1920 / G. Łukomski // Un. im. A. Mickiewicza w Poznani. Ser. Historia. – № 84. – 167 s.
4. Турук, Ф. Белорусское движение. Очерк истории национального и революционного движения белорусов / Ф. Турук. – М.: Гос. изд-во, 1921. – 125 с.
5. Лазько, Р.Р. Лісты Антона Луцкевіча з часу Парыжскай мірнай канферэнцыі / Р.Р. Лазько // ARCHE. – 2006. – № 10. – С. 54–81.
6. Знешняя палітыка Беларусі: зб. дак. і матэрыялаў: у 2 т. / склад. У.М. Міхнюк. – Мн.: БелНДІДАС, 1997. – Т. 1: 1917–1922 гг. – 395 с.
7. Ціхаміраў, А.В. Беларусь у сістэме міжнародных адносін перыяду пасляваеннага ўладкавання Еўропы і польска-савецкай вайны (1918–1921) / А.В. Ціхаміраў. – Мн.: Рэтраспектыва, 2003. – 349 с.
8. Pobóg-Malinowski, W. Najnowsza historia polityczna Polski: w 2 t. / W. Pobóg-Malinowski. – Londyn: Gryfl, 1985. – T. 2: 1914–1939. – 900 s.
9. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: в 12 т. / ред. И.А. Хренов, Н. Гонсеровская-Грабовская; сост. С. Вроньский. – М.: Изд-во АН СССР, 1964. – Т. 2: Ноябрь 1918 г. – апрель 1920 г. – 719 с.
10. Навицкас, К. Литва и Антанта / К. Навицкас. – Вильнюс: Минтис, 1970. – 139 с.
11. Dokumenty z dziejów polskiej polityki zagranicznej: w 2. t. / Red. naukowa T. Jedruszczaka, M. Nowak-Kiełbikowej. – Warszawa: Instytut Wydawniczy Pax, 1989. – T. 1: 1918–1932. – 1036 s.
12. Дубровко, Е. Н. Позиция Великобритании по проблеме территориального оформления польского государства накануне мирной конференции 1919 г. / Е. Н. Дубровко // Новая и новейшая история Европы и США: исследования, проблемы, поиски: сб. науч. ст. – Мн.: БГПУ, 2007. – С. 26–30
13. Nowak-Kiełbikowa, M. Polityka Wielkiej Brytanii wobec Polski / M. Nowak-Kiełbikowa. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1975. – 432
14. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.): зб. дак. і матэрыялаў: у 4 т. Т. 1. 1 жніўня 1914 – 18 сакавіка 1921 гг., ч. 2. 3 студзеня 1920 г. – 18 сакавіка 1921 г. / склад.: А.Ф. Вялікі [і інш.]; рэдкал.: С.М. Мартынаў [і інш.] – Мн.: Юніпак, 2008. – 393
15. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: в 12 т. / ред. И.А. Хренов, Н. Гонсеровская-Грабовская; сост. С. Вроньский. – М.: Изд-во АН СССР, 1965. – Т. 3: Апрель 1920 г. – март 1921 г. – 607 с.
16. Зубачевский, В.А. Взаимоотношения Польши, России и Германии в 1920 г. / В.А. Зубачевский // Вопр. истории. – 2004. – № 7. – С. 41–55.
17. Ціхаміраў, А.В. Віленскае пытанне ў міжнародных адносінах 1918–1920 гг. / А.В. Ціхаміраў // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. – 2002. – № 3. – С. 37–45.
18. Kasparaviczius, A. «Karta białoruska» w grze dyplomatycznej Kowna i Moskwy w latach 1920–1926 / A. Kasparaviczius // Białoruś w XX stuleciu. W kręgu kultury i polityki. Pod red. Doroty Michaluk. – Toruń: Wyd. naukowe univ. M. Kopernika, 2007. – 734 s.
19. Kukulka, J. Francja a Polska po traktacie wersalskim (1919–1922). / J. Kukulka – Warszawa: Książka i Wiedza, 1970. – 624 s.
20. Документы внешней политики СССР: в 21 т. / Комис. по изд. дипломат. док.; А.А. Громыко [и др.]. – М.: Политиздат, 1959. – Т. 3: 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – 723 с.